ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі універсітэт



№ 16 (898) | Субота, 4 лістапада 1995г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ:


1.◆ Навіны апошніх дзён.
2.◆ Педпрактыка -- важны этап у падрыхтоўцы спецыялістаў.
3.◆ Пранікненне ў таямніцы даўніны.
4.◆ Спрэчку вялі знатакі.
5.◆ Пра складаны наш сённяшні час.
6.◆ Студэнцкі гумар. Што каму да спадобы.
7.◆ Калі хочаш быць здаровым.
8.◆ З падарожжа па Італіі. Паэтычнымі радкамі пра выдатнага паэта.


## АДПАЧЫВАЙЦЕ, НАБІРАЙЦЕСЯ СІЛ!

Жывем мы цяпер у надзвычай пераменлівы час. На жаль, толькі не ў лепшы бок. І нават мала каго парадуе, што 7-га лістапада зноў адноўлены як святочны дзень у гонар 78-й гадавіны Вялікага Кастрычніка. Але ён пройдзе без былых заклікаў і лозунгаў, якія не накормяць.

Тым не менш наперадзе ў нас тры выхадныя -- 5,6 і 7-га лістапада. У сувязі з гэтым застаецца пажадаць: адпачывайце, набірайцеся сіл!

## НА САВЕЦЕ УНІВЕРСІТЭТА

На чарговым пасяджэнні Савета універсітэта першым па парадку дня было пытанне аб медыцынскім абслугоўванні, з інфармацыяй па якому выступіла старшыня прафкома студэнтаў Н.І.Колтышава. Як адзначалася, у гэтай справе яшчэ вельмі шмат праблем, якія звязаны з недахопам фінансавання, але тым не менш патрабуюць паступовага вырашэння. Бо наша здароўе і асабліва студэнцкай моладзі -- найважнейшая каштоўнасць.

Аб выкананні рашэнняў Савета ГДУ у 1994/95 навучальным годзе праінфармаваў яго вучоны сакратар Л.Я.Палякоў.

Па інфармацыі А.В.Лысянкова абмеркавана пытанне аб рабоце клуба мастацкай самадзейнасці.

Савет разгледзеў правілы прыёму студэнтаў ва універсітэт у 1996 годзе.

Па інфармацыях начальніка НДС Г.С.Міцюрыча зацверджаны тэмы, фінансуемыя са сродкаў дзяржбюджэту, якія прадстаўляюцца на конкурс у Міністэрства адукацыі і навукі, і Палажэнне аб конкурсе на лепшыя НДР.

На конкурснай аснове на пасады дацэнтаў выбраны: С.П.Жогаль -- па кафедры матэматычных праблем кіравання, У.М.Старчанка -- па кафедры тэорыі і методыкі фізічнай культуры, А.М.Гумен -- па кафедры геафізікі, М.У.Шаўчэнка -- па кафедры геаграфіі. Старшым выкладчыкам кафедры інжынернай геалогіі і гідрагеалогіі абраны А.Ф.Акулевіч.

## НА КАНФЕРЭНЦЫІ Ў ЗША

Ва універсітэце штата Пенсільванія адбылася чатырохдзённая міжнародная канферэнцыя па электрадынаміцы складаных асяроддзяў. Разам з амерыканскімі вучонымі ў ёй прынялі ўдзел вядучыя спецыялісты ў важнай галіне фізікі з Англіі, Германіі, Расіі, Францыі і іншых краін. Беларусь на гэтай канферэнцыі прадстаўляў дэкан фізічнага факультэта нашага універсітэта ўладальнік гранта "Сорасаўскі дацэнт" І.В.Семчанка, які выступіў з двума навуковымі дакладамі.

## *ВІНШУЕМ!*

***Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты матэматычнага факультэта горача віншуюць старшага выкладчыка кафедры матэматычных праблем кіравання СУКАЧ Алену Іванаўну з зацвярджэннем яе БелВАКам у вучонай ступені кандыдата тэхнічных навук.***

## *ЯГО ПАЭЗІЯ ЧАРУЕ ПРАЗ СТАГОДДЗЕ*

Сёлетняй восенню грамадскасць рэспублікі адзначае 100 год з дня нараджэння выдатнага рускага паэта Сяргея Ясеніна. З нагоды юбілею на факультэтах універсітэта быў праведзены цэлы шэраг мерапрыемстваў. У прыватнасці -- і гэта паказальна для нашага часу -- 6 кастрычніка ў госці да студэнтаў II курса рускага аддзялення прыйшлі трэцякурснікі з аддзялення беларускай мовы і літаратуры. Яны выступілі перад другакурснікамі з цікавай літаратурна-навуковай кампазіцыяй аб лірычнай паэзіі і трагічным жыццёвым лёсе песняра "бярозак і лугоў, звяр"я і люду", як пісаў аб Ясеніне Я.Еўтушэнка. Было прачытана каля двух дзясяткаў вершаў паэта і ўрыўкаў з паэм. Студэнты адзначылі як фальклорна-разанскія, так і ўласна літаратурныя вытокі творчасці Ясеніна, прааналізавалі тыя спрэчкі аб матывах трагедыі паэта, якія нярэдка ўзнікаюць у перыядычным друку. Вядучая кампазіцыі студэнтка Наталля Шаньгіна разам са сваімі сяброўкамі далі добры прыклад рускаму аддзяленню, як трэба з вялікай павагай, улюбёнасцю і глыбінёй аналізу ўшаноўваць памяць вялікага паэта-лірыка.

Вось прозвішчы дзяўчат беларускага аддзялення, якія сваімі прадуманымі дакладамі аб Ясеніне заслужылі павагу і ўдзячнасць студэнтаў рускага аддзялення: Наталля ШАНЬГІНА, Таццяна СІДАРЭНКА, Алена КСЯНДЗОВА, Вольга КЛЮЙКО, Наталля АРХІПЕНКА, Галіна РУСІНОВІЧ і Вольга КАЧАНОЎСКАЯ.

**М.РОДЧАНКА,**
**дацэнт кафедры рускай літаратуры.**

# ПЕДАГАГІЧНАЯ ПРАКТЫКА: СІСТЭМАЎТВАРАЛЬНАЯ РОЛЯ

Працэс фарміравання будучых настаўнікаў у педагагічных навучальных установах уключае ў сябе, як вядома, чатыры асноўныя блокі: агульнанавуковую падрыхтоўку па дысцыплінах, асновы якіх ім неабходна будзе выкладаць у школе; забеспячэнне філасофска-светапоглядавага развіцця; вывучэнне цыкла псіхолага-педагагічных прадметаў і, нарэшце, педагагічную практыку. Навуковых жа крытэрыяў для вызначэння аб"ёму падрыхтоўкі студэнтаў па кожнаму з гэтых "блокаў" да гэтага часу не выпрацавана. Усё вырашаецца эмпірычна. У савецкі час, напрыклад, галоўным было грамадска-палітычнае фарміраванне будучых настаўнікаў. На другім месцы стаяла агульнанавуковая падрыхтоўка. Трэцяе месца займала вывучэнне цыкла псіхолага-педагагічных дысцыплін і затым ішла педагагічная практыка.

З улікам падобнай субардынацыі вызначаўся склад вучэбных дысцыплін па кожнаму "блоку" і час, які адводзіцца на іх вывучэнне. Натуральна, што ў гэтай іерархіі больш за ўсё пакутвалі псіхолага-педагагічныя навукі і педагагічная практыка: яны то скарачаліся, то перастаўляліся з курса на курс, то "сумяшчаліся" паміж сабой, як гэта здарылася, напрыклад, ва універсітэтах з педагогікай і методыкай выхаваўчай работы.

Патрэбны былі новыя тэарэтычныя ідэі, якія ахоплівалі б усе бакі прафесійна-педагагічнай падрыхтоўкі будучых настаўнікаў і адкрывалі абгрунтаваныя падыходы да яе ўдасканалення.

У якасці такой ідэі з"явілася палажэнне аб неабходнасці **педагагізацыі** адукацыйна-выхаваўчай работы ў навучальных установах, якія рыхтуюць настаўнікаў. Ідэя гэта вылучалася многімі вузаўскімі работнікамі, але найбольш змястоўна сфарміраваў яе Е.Н.Белазерцаў. Паняцце педагагізацыі ім трактуецца як арыентацыя ўсіх без выключэння дысцыплін і бакоў вучэбна-выхаваўчай работы ў педагагічнай ВНУ на будучую кваліфікацыю настаўніка, узбраенне студэнтаў канкрэтнага факультэта агульнанавуковымі, псіхолага-педагагічнымі і метадычнымі ведамі, уменнямі і навыкамі такім чынам, каб яны сродкамі свайго прадмета маглі забяспечыць высокую якасць навучання і выхавання /Гл.: Белозерцев Е.П. Подготовка учителя в условиях перестройки. М., 1989. С. 77-78/.

Сістэмаўтваральным жа фактарам гэтай арыентацыі ён лічыць педагагічную практыку. Супастаўляючы патрабаванні школы да настаўніка і аналізуючы плюсы і мінусы педпрактыкі студэнтаў, можна больш рацыянальна вызначаць пералік профільна-навуковых для дадзенага факультэта, грамадскіх і псіхолага-педагагічных дысцыплін, вывучаемых у педагагічных навучальных установах, а таксама месца самой практыкі ў сістэме падрыхтоўкі будучых настаўнікаў. З такога пункту гледжання патрабуюць прадуманага разгляду многія пытанні, звязаныя з удасканаленнем гэтай падрыхтоўкі.

Няма сумнення ў важнасці грунтоўнай навуковай эрудыцыі студэнта па профілю той дысцыпліны, прадмет якой ён будзе выкладаць у школе. Але ці забяспечваецца такая падрыхтоўка? У перыядычным друку адзначаецца, што справа зводзіцца да таго, каб больш поўна прадставіць сістэму дысцыплін, уваходзячых у склад той або іншай навукі, і як мага шырэй распрацаваць іх змест. Аднак гэта зусім не з"яўляецца дастатковай умовай для таго, каб выпускнік універсітэта або педінстытута быў добра падрыхтаваным у гэтых адносінах да педагагічнай дзейнасці /Гл.: Злоцкий Г.В. Ориентация студентов-математиков на педагогическую профессию //Советская педагогика. 1989. N6. С.97/. Празмерна расцягнуты аб"ём вывучаемага матэрыялу прыводзіць да перагрузкі студэнтаў, наносіць урон развіццю навыкаў самастойнай работы і, як паказвае вопыт вузаўскага навучання, не забяспечвае добрых ведаў. Пакуль, на жаль, гэта не выклікае трывогі.

Не спыняюцца дыскусіі па пытанню, ці дастаткова падрыхтаваныя выпускнікі педагагічных навучальных установаў па школьнаму вучэбнаму прадмету? Педпрактыка паказвае, што недастаткова. Каб пераадолець гэты недахоп, у Францыі перад накіраваннем на педпрактыку студэнты здаюць вельмі строгі экзамен па школьнаму прадмету. У нас жа нясмелыя прапановы прыняць неабходныя меры да паляпшэння ведаў будучых настаўнікаў па школьнаму прадмету парыруюцца тым, што, маўляў, засваенне навукі быццам само па сабе забяспечвае для гэтага неабходную падрыхтоўку, і таму не варта траціць час на "школярское натаскивание".

Відавочная слабасць ведаў па псіхолага-педагагічных дысцыплінах. Праводзячы ўрокі і пазакласныя заняткі ў школе, студэнты не асэнсоўваюць іх псіхалагічных і дыдактычных асноў, таму што недастаткова засвоілі псіхалогію, педагогіку і прыватныя методыкі.

Шмат прабелаў "высвятляе" педагагічная практыка ў прафесійна-асабовым фарміраванні будучых настаўнікаў /неразвітасць мовы, няўменне размаўляць з навучэнцамі, а таксама кіраваць сваімі паводзінамі і г.д./.

Многія гады пры рашэнні пытанняў падрыхтоўкі настаўнікаў ішлі, як кажуць, зверху ўніз: ад тэорыі да педагагічнай практыкі. Як паказвае выкладзенае, надышоў час падысці да гэтай праблемы і знізу ўверх: ад педагагічнай практыкі да вызначэння тэарэтычнай падрыхтоўкі. Тады сапраўды больш відавочнымі стануць тыя праблемы, якія накапіліся ў прафесійна-педагагічным фарміраванні студэнтаў і якія маюць патрэбу ў прадуманым вырашэнні. Ёсць гэтыя праблемы і ў нашым універсітэце. Іх неабходна вырашаць, калі мы жадаем забяспечваць школу кваліфікаванымі настаўнікамі.

**І.ХАРЛАМАЎ,**
**загадчык кафедры педагогікі, прафесар, акадэмік АНБ.**

# КАБ ПОБАЧ БЫЛА ПРЫГАЖОСЦЬ

На вуліцы -- залатая восень. Прыгожая, сонечная, з празрыстым паветрам, настоеным на паху апалай жоўтай і чырвонай лістоты. Бадай, не знойдзеш чалавека, душу якога б не кранала гэта прыгажосць. І не абавязкова ісці ў парк, каб палюбавацца чароўнай восеньскай прыродай, яна -- побач з намі, можна сказаць на кожным кроку, вакол універсітэцкіх карпусоў і інтэрнатаў.

Каб заўсёды, у любы час года, радавала наша вока прырода, клапоцяцца на біялагічным факультэце ГДУ. Студэнты разам з выкладчыкамі кафедры батанікі і фізіялогіі раслін правялі нядаўна карпатлівую работу па асенняй пасадцы дрэў і кустоў. На універсітэцкай тэрыторыі імі было высаджана шмат рознага віду насаджэнняў, якія падрыхтавалі для гэтага ў Інстытуце лясной гаспадаркі.

**Т.НІКАЛАЕВА.**



АРХЕАЛОГІЯ

# ПА СЛЯДАХ ПЕРШАБЫТНАГА ЧАЛАВЕКА

**Ці даводзілася вам трымаць у руках каменную сякеру, якой чатыры тысячы гадоў? А наканечнік стралы, апошні палёт якой закончыўся тысячагоддзем раней? Ці краналася ваша нага зямлі, дзе свае сляды пакінуў чалавек каменнага стагоддзя?**

Не кожны зможа пахваліцца знаёмствам са старажытнымі старонкамі нашай гісторыі, тым больш, калі яно адбылося не ў бібліятэцы або музеі, а ў сапраўднай археалагічнай экспедыцыі. Студэнтам-гісторыкам 2 курса пашанцавала -- яны працавалі на раскопках, арганізаваных Інстытутам гісторыі Акадэміі навук Беларусі пры садзейнічанні нашага універсітэта і Гомельскага абласнога маладзёжнага фонду. Унікальныя даследаванні праводзіліся паблізу Рагачова, сярод сенажацяў і спрадвечных пойменных азёраў на беразе Дняпра. Тут, на невысокіх пясчаных дзюнах, у эпоху познекаменнага /неаліту/ і бронзавага стагоддзяў жылі нашы далёкія продкі. Стагоддзямі захоўвала іх таямніцы зямля, пакуль археолагі Акадэміі навук не адшукалі гэтыя помнікі глыбокай даўніны і не арганізавалі тут навуковыя даследаванні.

Дапамога універсітэта акадэмічным вучоным была істотнай: на раскопкі прыехалі 10 студэнтаў пад маім кіраўніцтвам. Палатачны лагер, арганізаваны па ўсіх правілах палявога быту, размясціўся ў прыгожым урочышчы Прорва, у двух кроках ад месц старажытных пасяленняў.

Навуковы кіраўнік раскопак неалітычнай стаянкі ў раёне Рагачова спецыяліст Інстытута гісторыі Ігар Язэпенка быў задаволены вынікамі пошуку: удалося раскрыць плошчу пасялення, заснаванага ў IV-III ст. ст. да нашай эры плямёнамі рыбаловаў і паляўнічых. Зямля захавала нямыя сведчанні той эпохі -- каменныя скрабкі, праколкі, разцы, нажы, сякеры, наканечнікі, стрэлы і россып адыходаў вырабу розных прылад у выглядзе крэмневых асколкаў і адшчэпаў. Адкладанні стаянкі змяшчалі сотні чарапкоў гліняных посуду ручной работы, кожны фрагмент якога пакрыты мудрагелістым арнаментам. На аснове знаходак, зробленых рукамі студэнтаў Сяргея Майсені, Віктара Каўтунова, Алега Хадановіча, Віталя Дуброўскага, Аляксандра Гулевіча і іншых, вучоныя будуць меркаваць аб этнічных і культурных працэсах, якія мелі месца на землях Беларускага Падняпроўя каля чатырох-шасці тысяч гадоў назад.

У III-II ст.ст. да н.э. на тэрыторыі Беларусі рассяляюцца плямёны першабытных землеўладальнікаў і жывёлаводаў, якія выраблялі гліняны посуд са "шнуровым" арнаментам. Прышэльцы, роднасныя старажытнаму насельніцтву Украіны, Польшчы, Германіі, узброеныя каменнымі шліфаванымі сякерамі, заснoўваюць свае пасёлкі ў асяроддзі мясцовых рыбаловаў і паляўнічых, уступаюць з імі ва ўзаемадзеянне. Адна з груповак гэтых плямёнаў спынілася ў наваколлі Рагачова.

Кандыдат гістарычных навук Мікалай Крывальцэвіч знайшоў тут рэдкі помнік -- месца старажытных могілак, раскопкі якіх былі пачаты ў мінулым годзе. З вялікай зацікаўленасцю слухалі ўдзельнікі экспедыцыі расказ аб дзіўных адкрыццях на беразе возера Прорва, разглядалі фотаздымкі і замалёўкі знаходак, чыталі тэкст навуковай археалагічнай справаздачы. Цяжка было ўявіць, што і ў гэтым годзе будуць прадстаўлены не проста знаходкі, але і адкрыцці.

Даследаванні магільніка бронзавага стагоддзя вялі студэнты Сяргей Жыхараў, Андрэй Замойскі і іншыя. Самым удалым археолагам аказаўся Віталь Казаннік, які разбіраў старажытны культурны пласт з такой скрупулёзнасцю, што ад яго ўвагі не знікалі нават драбнейшыя рэчы. Пошук закончыўся адкрыццём некалькіх пахаванняў з астанкамі памёршых, спаленых у адпаведнасці з канонамі язычаскага пахавальнага абраду. У магільных ямах былі знойдзены тонкія керамічныя сасуды, масіўныя каменныя нажы і сякеры, іншыя рэчы эпохі бронзы. Усе яны пасля адпаведнага навуковага даследавання зоймуць сваё месца ў фондах і новай экспазіцыі Рагачоўскага краязнаўчага музея.

Работа ў экспедыцыі была не толькі своеасаблівым працягам археалагічнай практыкі. Студэнтам выпала магчымасць выпрабаваць свае веды па замежных мовах. На раскопках працавалі іх равеснікі -- студэнты з Францыі, Галандыі, Іспаніі, якія хацелі зведаць рамантыку ў невядомай для іх краіне. Цікавыя і карысныя зносіны не абмяжоўваліся "мовай жэстаў": у лагеры гучалі беларуская, руская, французская, англійская, нямецкая мовы, і ўсе цудоўна разумелі адзін аднаго. Самых, бадай, лепшых поспехаў у ролі перакладчыка дабіліся "англічанін" Максім Захарчанка і "немец" Сяргей Сакалоўскі.

Для нашых студэнтаў работа ў экспедыцыі была падзеяй, якая запамятаецца на многія гады. Застанецца ў памяці і рамантыка навуковага пошуку, і начныя кастры, і купанне ў крынічнай вадзе. Але самае, бадай, галоўнае -- гэта зносіны з прадстаўнікамі рэдкай прафесіі -- археолагамі, сапраўднымі вучонымі-падзвіжнікамі, якія "заразілі" будучых гісторыкаў трапяткімі адносінамі да ўсё яшчэ загадкавага мінулага нашага краю.

**А.МАКУШНІКАЎ,**
**дацэнт кафедры ўсеагульнай гісторыі, кандыдат гістарычных навук.**

*Канферэнцыі*

# АБ СУЧАСНЫХ ПРАБЛЕМАХ ФІЗІКІ

У г.Мінску на базе Інстытута атамнай і малекулярнай фізікі Акадэміі навук адбылася рэспубліканская канферэнцыя "Навуковае і аналітычнае прыборабудаванне", арганізатарамі якой былі АН Беларусі, Міністэрства адукацыі і навукі, Міністэрства прамысловасці рэспублікі.

На канферэнцыі даследчыкамі Беларусі, Украіны і Сірыі было прадстаўлена 90 дакладаў, аўтары якіх паведамілі аб выніках і стану распрацовак у галіне аптычнага, лазернага, электроннага і радыёфізічнага навуковага прыборабудавання. Значная частка дакладаў была прысвечана абмеркаванню метадаў і сродкаў для колькаснага і якаснага аналізу саставу рэчываў, кантролю тэхналагічных працэсаў, экалагічнага маніторынга.

Кафедра фізічнай метралогіі нашага універсітэта была прадстаўлена двума дакладамі, прысвечанымі праблеме ацэнкі якасці апрацоўкі звышгладкай паверхні.

***

У Магілёўскім машынабудаўнічым інстытуце прайшла VI міжвузаўская навукова-тэхнічная канферэнцыя краін СНД "Сучасныя метады і сродкі электрамагнітнага кантролю і іх прымяненне ў прамысловасці", арганізатарамі якой былі АН Беларусі, Міністэрства адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь, Магілёўскі машынабудаўнічы інстытут, Беларуская асацыяцыя неразбуральнага кантролю, навуковы Савет Расійскай Акадэміі навук па праблеме "Неразбуральныя фізічныя метады кантролю", Маскоўскі энергетычны інстытут.

Канферэнцыя прысвячалася памяці д.т.н., прафесара, загадчыка кафедры "Абсталяванне і тэхналогія зборачнай вытворчасці" ММІ А.М.Шаровай.

На канферэнцыі былі заслуханы 103 даклады па дзвюх рабочых секцыях, зробленыя вучонымі Беларусі, Расіі, Украіны і Літвы.

ГДУ быў прадстаўлены на канферэнцыі адным дакладам.

**В.СЕРАБРАКОЎ.**

# ПАДРЫХТОЎЧАЕ АДДЗЯЛЕННЕ ТАКСАМА ДЛЯ ЗДОЛЬНЫХ

У другой палове кастрычніка ў нашым універсітэце адбылося субясведаванне з падаўшымі заявы для паступлення на падрыхтоўчае аддзяленне. Сёлета конкурс аказаўся самым высокім за ўвесь час яго існавання. На 75 планавых месц прэтэндавала 315 чалавек. Як паведаміў рэдакцыі загадчык падрыхтоўчага аддзялення В.І.Яцухна, найбольшая канкурэнцыя склалася на спецыяльнасць "Руская мова і літаратура і беларуская мова і літаратура" -- 7,5 чалавека на месца. Сем прэтэндэнтаў на адно месца было на спецыяльнасць "Руская мова і літаратура", па 6 -- на спецыяльнасці "Беларуская мова і літаратура і англійская мова", "Руская мова і літаратура і англійская мова".

Многія з паступаючых на падрыхтоўчае аддзяленне паказалі грунтоўныя веды, таму для залічэння выбраць самых дастойных было не проста. Звыш плана набрана пэўная колькасць слухачоў за аплату навучання.

Заняткі на падрыхтоўчым аддзяленні пачаліся з лістапада.

/Наш кар./

## ПРАЙШЛІ ПЕРАДДЫПЛОМНУЮ ПРАКТЫКУ

У кастрычніку завяршылася пераддыпломная практыка ў пяцікурснікаў шасці спецыяльнасцей нашага універсітэта. Яе прайшлі ўжо 277 будучых маладых спецыялістаў. Філолагі замацоўвалі свае веды на працягу двух месяцаў, а біёлагі, географы і выпускнікі наступнага года спецыяльнасці "Гісторыя і англійская мова" -- шасці тыдняў.

Нашы студэнты праходзілі практыку ў 34 школах г.Гомеля і 28 -- вобласці. Найбольшая колькасць практыкантаў была ў гомельскіх СШ №№ 8, 10, 16, 26, 44, 56, якія лічацца аднымі з лепшых у абласным цэнтры.



**На здымку: урок па англійскай мове ў 11-м класе апорнай універсітэцкай школы № 56 вядзе пяцікурсніца гісторыка-юрыдычнага факультэта / спец. "Гісторыя і англійская мова"/ Ірыны Маянц. Яе першыя крокі ў самастойнай педагагічнай дзейнасці атрымалі высокую адзнаку.**

**Фота У.Чысціка.**

## ЗНАТАКІ Ў ГДУ

Напэўна, нямногія студэнты нашага універсітэта ведаюць аб тым, што 19 кастрычніка з 19 гадзін ў актавай зале ГДУ праходзіла шоу-гульня "Брэйн-рынг", якую праводзіў клуб інтэлектуальных гульняў эканамічнага факультэта. Інакш, я думаю, яны б пастараліся яе не прапусціць. Тым больш, што паміж раундамі выступаў любімы публікай СТЭМ "Лёлікі-Болікі" са сваімі старымі і новымі мініяцюрамі. У агульным, было весела.



А цяпер аб сур"ёзным: аб самой гульні . Яе вёў адзін з вядомых ігракоў клуба Аляксей Чыстоў. Ён замяніў сапраўднага вядучага ўсіх брэйнаў у Гомельскім клубе інтэлектуальных гульняў "Белая Рысь", які вырашыў пагуляць на гэты раз са сваёй камандай "Зборная Л.Клімовіча". І нават дайшоў да паўфінала, дзе ўсё ж у напружанай барацьбе аддаў пальму першынства не менш вядомай камандзе клуба "Злавесныя Сухары" /капітан -- Анатоль Мядзведзеў/ (на здымку), хаця ў камандзе Л.Клімовіча і гулялі 3 ігракі зборнай Беларусі па Брэйн-рынгу.

У гульні прынялі ўдзел і іншыя не менш вядомыя каманды: "Зялёны змій" Аляксея Кавалёва (неаднаразовы чэмпіён "Кубка Палесся"), "Асгарт" Алега Чэркаса, "Моцны арэшак" -- капітан Аляксандр Варобій, "Тандэм" Алега Фёдарава -- сярэбраны прызёр чэмпіянату па "Што? Дзе? Калі?" 1995 года, і некалькі іншых каманд.

У фінале сустракаліся "Злавесныя Сухары" і "Асгарт" Алега Чэркаса. Пасля напружанай барацьбы, а гульня ў фінале, як вы ведаеце, цягнецца да 6 ачкоў, перамагла з лікам 7:4 каманда матэматычнага факультэта ГДУ "Злавесныя Сухары".

Гледачы ж маглі назіраць не толькі добрую гульню каманд і выступленне СТЭМа, але і правярыць свае веды, згуляўшы з Леанідам Валянцінавічам у эрудыт-лато, а таксама адказваючы разам з камандамі на пытанні вядучага.

**А.КАДОЛ,**
**студэнтка III курса гісторыка-юрыдычнага факультэта.**



На тэму дня

# АБ ПАРАДОКСАХ НАШАГА ЖЫЦЦЯ

Сказаць, што наша эканоміка знаходзіцца ў вострым крызісе, -- значыць нічога не сказаць. Гэта наяўны факт, які не паддаецца сумненню. Але вось у чым прычына гэтага крызісу? Адказ даюць зусім розны, у залежнасці ад светапогляду адказваючых. І ў апошнія гады намецілася тэндэнцыя зніжэння колькасці прыхільнікаў рыначнай эканомікі і павелічэння жадаючых вярнуцца да дзяржаўнага планавага рэгулявання. А гэта значыць, што расце колькасць тых, хто схільны вінаваціць рынак у зніжэнні свайго матэрыяльнага дабрабыту. Пры гэтым маецца на ўвазе: тое, што зараз адбываецца ў эканоміцы, і ёсць той самы славуты рынак.

Але калі гэта сапраўды так, як тады растлумачыць той парадаксальны факт, што на канец чэрвеня ў рэспубліцы зарэгістравана ўсяго толькі 2,3% беспрацоўных, тады як у краінах з сапраўднай рыначнай эканомікай узровень беспрацоўя 3-5% сведчыць аб уздыме эканомікі? А вось пры вострым крызісе, як у нас, узровень беспрацоўя дасягае 14-21%. Адказ на гэтае пытанне можа быць толькі адзін -- наша кіраўніцтва ні на мінуту не перапыняла жорсткае дзяржаўнае рэгуляванне рынку працы. І ўжо толькі па адной гэтай прычыне можна смела сцвярджаць, што да сапраўднага рынку мы яшчэ не наблізіліся. Аднак падмяніць закон эканомікі дзяржаўным рэгуляваннем немагчыма. І калі эканамічны крызіс суправаджаецца высокім узроўнем беспрацоўя, дык ёсць яно і ў нас, толькі мае скрыты характар. Таму давайце ўсё ж паспрабуем ацаніць яе рэальны ўзровень.

Па статыстыцы страты рабочага часу ў прамысловасці за першае паўгоддзе склалі 9,2% ад агульнага календарнага фонду. Гэта значыць, столькі часу фармальна занятых на вытворчасці фактычна лічацца беспрацоўнымі. Таму толькі за лік прастою прадпрыемстваў узровень беспрацоўя адразу павышаецца да 11,5%. Але ёсць яшчэ адзін фактар скрытага беспрацоўя, які звычайна не ўлічваецца. Вось канкрэтны прыклад.

Усю рэспубліку абляцела навіна аб Валянціне Сматрыцкай, токары Гомельскага радыёзавода, якая на двое сутак прыкавала сябе да станка жалезным ланцугом. Такім незвычайным чынам давед зеная да адчаю жанчына патрабавала выплаціць ёй і астатнім працуючым двухмесячную запазычанасць па зарплаце. Але чалавека, якому не плацяць за выкананую ім работу, таксама можна лічыць беспрацоўным. Таму мы можам смела дадаць да скрытага беспрацоўя яшчэ каля 5% і ацаніць агульны яго ўзровень у рэспубліцы звыш 17%.

Але дзе ж шляхі выйсця з гэтага крызісу? І чаму такі высокі ўзровень беспрацоўя не прывёў да сацыяльнага выбуху? Звычайна гэта тлумачаць нашай беларускай "памяркоўнасцю". Але мне здаецца, прычына зусім у іншым. Працягваючы верыць дзяржаве і ў яе плануючую сілу, лаючы рынак, наш народ, тым не менш, знайшоў сапраўды рыначнае рашэнне самазанятасці, якое кампенсуе 17-працэнтнае беспрацоўе. Па дадзеных польскай прэсы, у мінулым годзе ў Польшчы пабывалі 3,7 млн. беларусаў, якія набылі там тавараў на 130 млн. долараў. Паколькі эканамічна актыўнае насельніцтва рэспублікі складае 5 млн. чалавек, можна смела сцвярджаць, што гэтымі беларусамі былі не толькі прадпрымальнікі, але і нашы рэальныя беспрацоўныя. Калі на большасці дзяржаўных прадпрыемстваў назіраецца спад вытворчасці, беспрацоўныя стварылі цэлую галіну эканомікі пад назвай "бізнес-тур", гандлёвы абарот якой, па ацэнцы экспертаў, складае каля 1 млрд. долараў у год! Вось у каго нашаму кіраўніцтву трэба браць крэдыт.

Другім накірункам самазанятасці сталі дачныя ўчасткі. І нельга разглядаць беларускае садовае агародніцтва як простае хобі. Гэта таксама цэлая галіна эканомікі, у якой заняты каля 3,5 млн. чалавек і якая ўжо ў мінулым годзе дала нашай гаспадарцы 85% усёй вырашчанай бульбы і 76% гародніны. І ў асабістых падсобных гаспадарках працягваюць устойліва павялічвацца аб"ёмы пасяўных плошчаў. Канешне, агародамі і бізнестурамі нашы людзі займаюцца не ад добрага жыцця. Але гэта рэальная эканоміка, якая прыносіць мільярдныя даходы, у якую дзяржава не паклала ні капейкі грошай! І што застаецца рабіць нашаму народу, калі ў легальнай эканоміцы дзяржава падаўляе /"рэгулюе"/ эканамічную актыўнасць. Развіццё малога прадпрымальніцтва практычна прыпынена непамернымі падаткамі. Іменна адсутнасць рынку, несапраўдная занятасць стрымлівае накірунак дзелавой актыўнасці насельніцтва на стварэнне новых, больш эфектыўных вытворчасцей, замест тых, што абанкруціліся.

Нядаўна Незалежным інстытутам сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў /НІСЭПД/ праведзена сацыялагічнае апытанне па праблемах рынку працы. Аказалася, што хаця на дзяржпрадпрыемствах у цяперашні час занята больш паловы працоўных, работу ў гэтым сектары эканомікі пры наяўнасці выбару выбраў бы толькі кожны пяты. Затое колькасць жадаючых працаваць на прыватных прадпрыемствах у пяць разоў перавышае колькасць рэальна занятых на іх. Відавочна, што такі выбар тлумачыцца больш высокімі заробкамі ў прыватным сектары. А стала гэта магчымым за кошт больш высокай яго эфектыўнасці.

Мы -- маленькая краіна з вялікім эканамічным патэнцыялам. Мы вымушаны прадаваць свой тавар за межамі Беларусі. Але ўсе акаляючыя нас краіны або ўжо маюць рыначную эканоміку, або яе паслядоўна будуюць. Таму нашыя вытворцы проста вымушаны працаваць у рыначных умовах, калі не ўнутры, дык за межамі рэспублікі. Таму і ва ўладзе павінны быць тыя, хто разумее, як працуе гэтая рыначная эканоміка.

**С.ЖАГОРАЎ,**
**ст. выкладчык кафедры правазнаўства**

ЮМОРЕСКА

# ЗАЩИТА ОТ ДУРАКА

Вечеринка, как обычно, удалась. Студенты, по совместительству бизнесмены и директора совместных предприятий, были довольны качеством закусок и напитков, среди которых традиционно преобладала местная водка. Похлопывая друг друга по могучим плечам престижных пиджаков, "хозяева жизни" разбредались по "мерседесам". Затем лихо газовали, автоматически выдерживая привычные маршруты и горланя весёлую чушь во тьму ночи.

Проводив последних гостей, организатор застолья господин Петряев принял меры к экстренному протрезвлению: сунул голову под кран с холодной водой /душ его как-то не вдохновлял/, принял внутрь стакан воды с парой таблеток растворимого аспирина, доел мясной салат из большой миски.

Теперь можно было браться за дело, ради которого всё и было затеяно. И как ловко получилось! В пьяном разговоре директор коммерческого банка "Гоп-стоп лтд" господин Кузьков выболтал номер своего валютного счёта и код банковского компьютера. "Халявщик", -- констатировал Петряев. Он подключил к сети свой персональный компьютер и уверенно положил дрожащие руки на клавиши.

Троечник Петряев дождался своего звёздного часа! Он вошёл в память банковского компьютера. "Долларов, долларов побольше на свои кредитные карточки перевести, -- билась в голове сладкая мысль. -- Утром карточки забрать, выкупить в "Грандтуре" путёвку в Германию, а там..." Мираж сладкой обеспеченной жизни затуманил мозги.

Большой банковский компьютер с программным обеспечением неадекватно воспринял вторжение извне. Ячейки его мозга не могли понять, зачем вдруг понадобилось в нерабочее время переводить куда-то валюту. "Дурацкие действия", -- определила машина и включила систему защиты. И мощный электрический разряд пошёл по работающему каналу.

Утром тело Петряева нашли около сгоревшего персонального компьютера. Покойный так и застыл с блаженной улыбкой на лице.

Похороны были торжественными. После долгих поминок друзья и бывшие коллеги разъезжались по домам. Директор банка Кузьков, утерев слёзы, забрался в свою "шестисотку". Он был доволен -- испытание системы "защиты от дурака" прошло успешно. "А недаром профессор как-то назвал покойного дураком, -- тихо улыбнулся Кузьков. -- Иначе бы защита не сработала". Потом задумался и логично решил: "Самому тоже за пульт садиться не надо. Мало ли что..."

**К.ЛАПКИН.**

Лідэр

# ВОСЕНЬ... ЧАС ПАПОЎНІЦЬ ФАНАТЭКУ



Ні для каго не сакрэт, што "музычны бізнес" у нас у краіне развіваецца па сваіх непрадказальных, тыпова "нашанскіх", "саўковых" правілах і законах. Таму спрабаваць што-небудзь прагназіраваць -- справа не толькі вельмі безнадзейная, але і ў вышэйшай ступені няўдзячная. Таму сёння размова пойдзе аб тых альбомах, якія ўжо выйшлі.

"Звон уходящего лета" і пачатак восені папоўнілі не толькі багаж уражанняў большасці грамадзян, але і іх фанатэкі. На змену ўжо надакучыўшым за мінулую зіму і вясну шведам з групы "И-Тайп" з іх мега-шлягерам "Зроблена ў Швецыі", дастаткова шырока ў летне-восеньскі перыяд "раскручваліся" усюды, дзе толькі можна /і дзе нельга таксама! -- ТБ/ "Яки -- Да", якая "бачыла, як ты танцуеш" і "Гранітны каменьчык" "Божьей коровки": любяць у нас у народзе дзявочыя дуэты і "слязлівыя" опусы з мінімумам сэнсу. А наогул з поп-музыкі законнай і заслужанай папулярнасцю карысталася "Бейсик Элемент" з альбомам "Апошняя прагулка" і Пандора з альбомам "Свет,які гаворыць". Нядрэнна раскупляліся Сандра, "Лофт" і Хадавэй з прграмай "Драйв". Для аматараў яшчэ больш прымітыўнага шырпатрэбу ва ўсіх камерцыйных ларках былі ў наяўнасці "Тэйк Зэт", "Ист-17" і "Ту Анлимитед". Усю гэтую музычку можна азначыць фразай групы "Макс": "Ё Май Гетаузй" /45-ці мінутныя міксы дэнса, тэхна і пауэр стыляў.../. Аматары сінтэзу харда і гранджа па вартасці ацанілі групы "Саундгарден" і "Стоун Темпл Пайлот". Больш "загорнутыя" на альтэрнатыўнай музыцы слухалі "Уайт Зомби", "Клауфингер", "Хаус Оф Пейн" і "Элис Ин Чейн".

Ветэраны рок-баталій Стынг, Эрык Клептан, Элтан Джон, Бон Джові, Ціна Тэрнер працягваюць радаваць сваіх старых і верных прыхільнікаў сваімі альбомамі, вытрыманымі ў класічных стандартах. "Жаночы эшалон" музыкі быў прадстаўлены дастаткова шырока: Мадона "Бед Тайм Стори", Б"юрк "Пост", Торы Амас, Мерайя Кэры, Алёна Апіна, Алёна Свірыдава, Валерыя, Анжаліка Варум, Наталля Каралёва і многія ім падобныя прадставілі свае новыя запісы на касетах "Вігма", "Інтэртакт" і "Брэстан".

Стыль "рэтра" -- модны зараз -- быў увасоблены ў выглядзе рэміксаў старых рэчаў і кампазіцый такіх "монстраў" як "Скорпионс", "Кисс", "Свит", "Иглз", "Бони-М", "АВВА", "Z.Z.Топ", "Чингиз-Хан", "Сикрет Сервис", "Смокки" и "Куин"... З айчынных груп нельга не назваць "Агату Кристи", "Наутилус Помпилиус", "ДДТ", "Крематорий", "Чайф", "Сектор Газа" і "Аквариум", новая праграма якога, што выйшла пад назвай "Навігатар", запісвалася ў Лондане. Гэта вельмі станоўча адбілася на яе якасці.

Для трэшараў будуць цікавымі "Содом", "Люрти фикейшн", Грейв Диггер" і "Морбид Энджел". Для аматараў тэхна і рэйва -- "Кибер Марио", "Дас Модуль", "Эппликейшн" і "Ритм Дэнс Мешин". Аматары "індзі" музыкі будуць зацікаўлены запісамі "Минд Фанк", "Кренберриз", "Фэт Тьюзди", "Сьюд", "Волтэри", "Каунтинг Кроуз" і "Боди Кунт". Ну а тым, хто любіць "інтэлектуальныя" тэксты -- рэлізы 95-га года "Тед Ньюжент", "Рэйдж", "Чикаго", "Мэррилион", "Кинг Даймонд". І, канешне ж, новыя альбомы Стыва Уэя, Джо Сатрыяні, Рычы Блэкмара і цудоўнага флейтыста з "Джетро Талл" -- Яна Андэрсана...

Не ведаю, як вы, а я сабе іх запісаў...

**П.БЕСЯЦКІ,**
**вядучы рубрыкі "Лідэр".**



На медыцынскія тэмы

# ПАГАВОРЫМ АБ ЗДАРОЎІ

Рацыянальны рэжым працы, адпачынку, харчавання, захаванне правілаў асабістай гігіены, псіхагігіена, дастатковая рухальная актыўнасць, загартоўванне, адмова ад шкодных звычак /курэнне і ўжыванне алкаголю/, ад самалячэння і шкодна ўплываючых на здароўе абрадаў -- усё гэта неабходныя ўмовы для ўмацавання здароўя, дасягнення актыўнага даўгалецця.

Любая праца праз нейкі час выклікае стомленасць, таму неабходна чаргаваць яе з адпачынкам. Калі, прачынаючыся раніцай або пасля выхадных дзён, чалавек не адчувае сябе бадзёрым, значыць, напярэдадні ён не адпачываў так, як таго патрабуе яго арганізм.

Фізічная культура на свежым паветры, адпаведныя ўзросту фізічныя нагрузкі -- дзейсныя сродкі прафілактыкі многіх захворванняў, зняцця нярвова-эмацыянальнага напружання, крыніца бадзёрасці і добрага настрою.

Актыўны рухальны рэжым неабходны людзям любога ўзросту. Канешне, вельмі добра наведваць спартыўныя секцыі. Але калі такой магчымасці няма, неабходна актыўна праводзіць свой вольны час пасля заняткаў, у выхадныя дні.

Карысць прынясуць прагулкі пехатой, катанне на каньках, валейбол, турыстычныя паходы, а не вечары, праведзеныя каля тэлевізара. Не трэба забываць і аб штодзённай ранішняй гімнастыцы; пажадана прайсці частку шляху на работу пехатой, розныя віды хатняй працы карысныя не толькі для жанчын, але і для мужчын. Вячэрняя прагулка перад сном на свежым паветры -- залог добрага сну.

Праблемай сучаснага чалавека стала залішняя вага. Асноўныя прычыны гэтага -- змяненне характару харчавання і зніжэнне фізічнай актыўнасці. Неабмежаванае харчаванне паскарае працэс старэння арганізма і з"яўляецца фактарам рызыкі, глебай для развіцця шэрагу сур"ёзных захворванняў сардэчна-сасудзістай сістэмы, цукровага дыябету, артрозу і інш.

Існуюць агульныя прынцыпы рацыянальнага харчавання і іх трэба прытрымлівацца ўсім. Перш за ўсё гэта -- умеранасць; ежа "да адвалу" -- верны шлях да атлушчэння. Другая абавязковая ўмова -- разнастайнае харчаванне. Вялікае значэнне маюць прадукты, багатыя вітамінамі і мінеральнымі рэчывамі, асабліва свежыя садавіна і гародніна.

Непапраўны ўрон здароўю прыносіць курэнне і ўжыванне алкаголю. Прычым, чым маладзейшы чалавек, тым хутчэй узнікае залежнасць ад тытуню, алкаголю, і тым цяжэй потым адмовіцца ад іх.

Парушэнне рэжыму працы і адпачынку, адсутнасць фізічных нагрузак на фоне канфліктных сітуацый, узмоцненай дзейнасці і нярвова-эмацыянальнай напружанасці, недастатковы сон, шкодныя звычкі псуюць нярвовую сістэму, робяць яе лёгка ранімай.

Пад уплывам пералічаных фактараў /іх называюць псіхагеннымі/ пры адсутнасці сучаснага медыцынскага ўмяшальніцтва могуць развіцца розныя захворванні.

Уменне валодаць сабой, расслабляцца, пазбягаць канфліктаў можна ў сябе развіць, і гэта будзе садзейнічаць прафілактыцы многіх захворванняў.

**Н.МАРЧАНКА,**
**загадчыца медпункта ГДУ.**

Інфармацыя да разважання

# РУХ -- ГЭТА ЖЫЦЦЁ

Амаль 10 гадоў прайшло з таго моманту, калі наша рэспубліка аказалася пад радыеактыўным прэсам чарнобыльскай трагедыі. За гэты час пра Чарнобыль гаварылася нямала. Аднак і цяпер праблема не страціла сваёй актуальнасці. Наадварот: яшчэ больш востра паўстае неабходнасць прыняцця экстраных мер для яе вырашэння.

У сувязі з аварыяй на ЧАЭС знізіўся агульны ўзровень здароўя насельніцтва Беларусі. Год ад году гэты працэс становіцца ўсё больш інтэнсіўным. Менавіта гэта праблема стала адной з галоўных на нядаўна прайшоўшай у нашым універсітэце Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі "Праблемы фізічнай культуры насельніцтва ва ўмовах неспрыяльных фактараў навакольнага асяроддзя".

На сённяшні дзень фізкультура з"яўляецца самым танным, даступным і надзейным спосабам аздараўлення. Гэта -- актыўны рух, які, у сваю чаргу, паскарае абмен рэчываў у арганізме, што садзейнічае вывядзенню з яго радыенуклідаў. І наадварот: гіпадынамія, няправільнае харчаванне, ігнараванне любога роду фізічных практыкаванняў вядзе за сабой аслабленне арганізма, а ва ўмовах неспрыяльных фактараў навакольнага асяроддзя -- павялічвае верагоднасць сур"ёзнага захворвання.

"Спасение утопающих -- дело рук самих утопающих" -- гэты крылаты выраз становіцца ўсё больш падобным на кіраўніцтва да дзеяння.

Таму, калі мы "бережём силы" на занятках фізкультуры, імкнемся пазбягаць усялякіх нагрузак, знаходзячы апраўданне ў тым, што наш арганізм і без таго аслаблены экалагічна-неспрыяльнымі фактарамі, мы самі сябе асуджаем на павышаную адчувальнасць да захворванняў. Яшчэ ў старажытныя часы сцвярджалі: "Движение -- это жизнь".

**М.БАЛЬ,**
**студэнт II курса**
**філалагічнага факультэта.**

# СУСВЕТНАЕ ПЕРАКРЫЖАВАННЕ ТУРЫЗМУ

У цяперашні час, з майго пункту гледжання, Венецыя з"яўляецца сусветным перакрыжаваннем турызму. Заслугоўвае ўвагі Сабор Сан-Марко /IX-XV ст. ст./, царква і манастыр Сан Джорджыа Маджорэ /XVI ст./, Гранд-канал, Акадэмія мастацтваў, універсітэт, інстытут па вывучэнню Адрыятыкі, музей шкла. Цудоўны Палац Дожаў /дож -- кіраўнік Венецыянскай рэспублікі IX-XVIII ст.ст./ выбіраўся ўсё жыццё/. Наогул палацаў у Венецыі -- 157. Але, на жаль, горад разбураецца. Кампетэнтныя людзі лічаць, што руіны недатыкальныя, яны павінны быць закансерваваны. Хацелася б адзначыць, што Венецыя пабудавана на рускім лесе, вядома там, дзе ёсць будынкі і збудаванні з дрэва.

У вобласць Венецыі ўваходзіць і Верона, якую ўспамінае Шэкспір у сваіх творах.

З вельмі асабістых і не вельмі прыемных уражанняў адзначу коўзкія прыступкі ля самай вады. Міжволі давялося выкупацца ў адным з каналаў Венецыі разам з фотаапаратам. Хачу сказаць, што не адзін я купаўся ў гэтых водах. У свой час з адчаю прыгаў у канал і Казанова.

Перад ад"ездам мне нечакана ўспомніліся радкі з песні Б.Акуджавы аб Арбаце: "Ты течёшь как река -- странное название и прозрачен асфальт как в реке вода..."

**У.ЧЫСЦІК.**
**Фота аўтара.**



**На вуліцах Венецыі.**

## СЕРГЕЮ ЕСЕНИНУ

*Свет славы*
*В дымке лет не тает...*
*И, хоть исчезла*
*Травли гнусь,*
*Россия*
*Вновь переживает*
*Твоей души*
*И боль, и грусть.*
*Во мгле*
*Поблекли её дали*
*И цветь*
*Березовых одежд...*
*Смирясь,*
*Хранит она печали*
*Твоих*
*Несбывшихся надежд.*
*Бредет в беде*
*И неудачах,*
*Что и тебе*
*Познать пришлось...*
*Как ты,*
*Я мучаюсь и плачу:*
*Что с нашей Родиной*
*Стряслось?*

**Иван ХАРЛАМОВ**

**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ**

аб"яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:
- агульнай фізікі -- прафесара, дацэнта;
- матэматычнага аналізу -- асістэнта;
- фізвыхавання -- выкладчыка;
- оптыкі -- дацэнта.

Тэрмін падачы заяў -- не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699 г.Гомель, вул.Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

## СПОРТ

## САПЕРНІЧАЛІ СТРАЛКІ

У ціры Белдзяржуніверсітэта транспарту разыгра[...] першынство Гомеля па кулявой стральбе ў праграме гарад[...]ской студэнцкай спартакіяды. За ўзнагароды змагаліся спартсмены 20-ці факультэтаў ВНУ.

Прыемна адзначыць, што абсалютным пераможцам стала студэнтка IV курса эканамічнага факультэта нашага універсітэта Кацярына Багданава. Яе вынік — 96 ачкоў са 100 магчымых.

А вось як выглядае выніковая табліца. На першым месцы фізічны факультэт ГДУ -- 446 ачкоў. Усяго толькі на адно ачко адсталі матэматыкі. Трэцяе месца -- у электратэхнікаў з БелДУТа — 437, пятае — у нашых біёлагаў -- 434, шостае -- у эканамістаў -- 432, дзевятае — у стралкоў геолага-геаграфічнага факультэта — 425, дзесятае — у гісторыка-юрыдычнага -- 424, 13-е -- у факультэта фізічнай культуры -- 328 / не з"явіўся адзін залікова ўдзельнік/, 14-е -- у філолагаў -- 318 ачкоў.

**В.МАРЧАНКА.**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.
Рэгістрацыйны № 221
Спонсары газеты -- НВП "Сучасныя тэхналогіі", прафком студэнтаў.

Газета набрана і звёрстана на настольна-выдавецкім комплексе ІВЦ ГДУ, аддрукавана на Гомельскай фабрыцы "Палесдрук", г.Гомель, вул.Савецкая, 1.
За насавыя набор, вёрстку і памылкі фабрыка "Палесдрук" адказнасці не нясе.

Рэдактар Ул.П. БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.500 экз.
Заказ 596.
Падпісана да друку 31.10.95.